Памяць аб Яраславу Мудрым як разумным і разважлівым дзяржаўным дзеячу жыве і сёння.

1. За што Яраслаў быў празваны Мудрым?
2. Як зваўся закон, які вызначыў правілы жыцця для ўсіх жыхароў Кіеўскай Русі?
3. Што было зроблена Яраславам Мудрым, каб аб'яднаць дзяржаву?
4. У чым заключаўся запавет Яраслава Мудрага сваім сынам?

1. Разгледзьце картасхему «Шлях „з варагаў у грэкі“» на с. 17 вучэбнага дапаможніка. Пакажыце на ёй гарады, дзе былі пабудаваны Сафійскія саборы.
2. Паглядзіце на малюнак на с. 40 вучэбнага дапаможніка. Па чым можна здагадацца, што Яраслаў Мудры — князь і адукаваны чалавек?

## 11. УСЯСЛАЎ ЧАРАДЗЕЙ

У краі блакітных азёр, у горадзе Полацку, у **11 стагоддзі** правіў князь **Усяслаў**. Чуткі пра яго хадзілі па ўсім белым свеце. Гаварылі людзі пра Усяслава living рознае. Быццам то ваўком абернецца, то турам, то сокалам. Нібыта абягаў ён ды аблятаў межы свайго княства, за што і празвалі Усяслава **Чарадзеем**. Каб абараніцца ад ворагаў, полацкі князь збіраў сваю **дружыну**.

 Правообладатель Издательский центр БГУ

Прыходзілі воіны, каб яе папоўніць. І ўсе маладыя, ды і самому Усяславу было тады пятнаццаць гадоў.

Мацаваў Усяслаў свой горад, а з ім і ўсю Полацкую зямлю. Полацк пры князю Усяславу стаў не проста вялікім, а найбуйнейшым горадам на ўсходнеславянскіх землях. Усяслаў пабудаваў у Полацку



Полацкі князь Усяслаў па празванні Чарадзей



Княжацкі дружыннік

Правообладатель Издательский центр БГУ



Полацкі Сафійскі сабор

новы вялікі замак, абнёс яго высокай драўлянай сцяною і глыбокімі рава́мі. Не пераскочыць, не пералезці. У самім жа замку паўстала дзіва — сабор Святой Сафіі, як у Кіеве і Ноўгарадзе.

Дакажыце з дапамогай малюнка на с. 5 атласа, што старажытны Полацк з'яўляўся вельмі буйны́м горадам.


Правообладатель Издательский центр БГУ



Бітва на Нямізе. Малюнак з летапісу

Калі княству пагражала небяспека, Усяслаў вымаў свой меч і смела кідаўся ў бой. Так было ў сакавіку **1067 года**, калі адбылася бітва на рацэ Нямізе. Аб гэтым у летапісе паведамлялася: «І сустрэліся праціўнікі на Нямізе месяца сакавіка ў трэці дзень, быў снег вялікі, і пайшлі адзін на аднаго. І была лютая сеча, і многія палеглі ў ёй».

Пражыў Усяслаў Чарадзей больш за 70 гадоў. Пры яго жыцці Полацкае княства дасягнула найбольшага росквіту і праславілася сярод іншых дзяржаў. Памяць аб славутым продку ўшанавана помнікам у яго родным горадзе.

А Разгледзьце карту «Славутыя людзі зямлі беларускай» на с. 14—15 атласа. Пакажыце на ёй помнік Усяславу Чарадзею і горад, дзе гэты помнік узведзены.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Раскажыце, чаму полацкага князя Усяслава празвалі Чарадзеем.
**2.** Чым адметнае княжанне Усяслава Чарадзея?
**3.** Успомніце гістарычную падзею, якая звязана з ракой Нямігай.
**4.** Ці можна лічыць Сафійскі сабор у Полацку сімвалам (знакам) самастойнага Полацкага княства? Свой адказ патлумачце.

Карыстаючыся малюнкам на с. 44 вучэбнага дапаможніка, зрабіце апісанне сабора Святой Сафіі ў Полацку. Словы для выкарыстання: *велічны, купалы, крыжы, светлы колер, цэгла, байніцы*.

## 12. ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ

Велічны звон склікае палачан на сход на плошчу каля Сафійскага сабора. Сюды спяшаюцца дарослыя мужчыны, гатовыя стаць пад княжацкія сцягі і бараніць сваю зямлю ад ворагаў. Князь пазірае на людскі натоўп, думае думу. Час выступаць у паход.

Па вузенькіх вулачках горада спяшаецца дзяўчынка. Гэта **Прадслава**. Ідзе хутка і ўпэўнена — горад ёй добра знаёмы. Праз хвіліну дзяўчынка ўжо каля сабора. Тут лечаць пара-


Правообладатель Издательский центр БГУ